Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 34 (63) Панядзелак, 17-га кастрычніка 1927 г. м. Вільня. Год II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень

Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае [illegible] культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмакратыз[illegible] [illegible]янальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй



Падпісная [illegible]

[illegible]эдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
[illegible]я адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
„ У тэксце . —40 гр.
„ На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

Няг[illegible] работа.

„Лаўры Мільціада не даюць мне супакою", сказаў некалі казачны герой старасьвецкай Грэцыі. І лаўры здабыў.

Не думаем, каб гэты гістарычны прыклад быў ведамы п. Ярэмічу, ня раз ужо даўшаму доказ поўнай нявіннасьці па часьці адукацыі. Але відаць лаўры творца „16-кі" ў 1922 г. А. Луцкевіча не даюць т'кі спакою збунтаванаму гадунцу „манарха": на цта рупліва пачынае ён кратацца па стварэньню новай „16-кі".

Канешна паміж Луцкевічам і Ярэмічам ня можа быць параўнаньня ў сэнсі інтэлектуальным і палітычнай сьпеласьці. Той разумеў, што робіць, да чаго ідзе і як асягнуць сваю мэту. Ярэміч усей сваей дасюлешняй працай ня сьцьвердзіў таго, што ён варты свайго вучыцеля і што адукацыя школы Луцкевіча не змарнавалася.

Луцкевічаўская „16-ка" па тагачасным палітычным абставінам магла мець пасьпех і мела яго. Але за 5 гадоў, якія нас аддзеляюць ад таго часу, абставіны і палітычныя і грамадзкія настолькі зьмяніліся, што самую ідэю тварэньня цяпер новай „16-кі" на такіх-жа, як тады, падставах павінна з беларускага боку сустрэцца з запытаньнем: што гэта, глупота толькі, ці яўная здрада?

Сапраўды: саюзьнікі па „16-цы" 1922 г.— расейцы, жыды і немцы за гэтыя 5 гадоў далі даволі доказаў ня толькі супярэчнасьці іхніх інтарэсаў з нашымі, але выявілі эгаізм, які ставіў іх ня раз у Сойме ў шэрэгу нашых праціўнікаў, а расейцы дык прост выказалі сябе здэцыдаванымі ворагамі самай ідэі нашага нацыянальнага істнаваньня.

На зьездзе г. зв. Расейскага Нацыянальнага Аб'еднаньня, на сабраньнях і канфэрэнцыях расейцы адкрыта запярэчваюць самае істнаваньне беларусаў і украінцаў як Народаў. Яны нічаму не навучыліся за гады вайны, рэвалюцыі і, загыпнатызаваныя мінуўшчынаю і запэўненьнямі сваіх верхаводаў аб хуткім звароце „адзінай недзялімай", сьпяць і мараць толькі аб тым, каб ізноў перарабіць Расею ў „турму народаў".

З кім — кім, але з імі нам ужо віяк не па дарозе. Праўда на гэта могуць адказаць, што ня ўсе расейцы — ворагі нашага нацыянальнага вызваленьня. Што ёсьць спрыяючыя гэтаму вызваленьню і г. д.

Канешна — ў сям'е не бяз вырадкаў. Але як адна ластаўка ня робіць вясны, так і асабістыя сымпатыі нязначнай па ліку часткі расейскай арыстакрацыі духа — ня могуць брацца ў рахунак. Палітыка будуецца не на сэнтымэнтах, а на рэальных саадносінах народаў так, як унутры кожнага народу на саадносінах клясаў і грамадзкіх групаў.

Гэткім чынам кожнаму разумнаму палітыку сяньня ясна, што ні Украінцам, ні Беларусам нечага шукаць саюзьнікаў у расейскім грамадзянстве Польшчы. Трэ ісьці сваёй дарогай, ўзаемна падтрымоўваючы адзін аднаго, бо толькі паміж украінцамі і намі істнуе і супольнасьць інтарэсаў і адзінства імкненьняў і ідэалаў.

Кожнаму гэта зразумела, але не п. Ярэмічу і тым, іжэ з ім.

Гэтыя „адзіныя прадстаўнікі Беларускай незалежніцкай думкі", гэтакія гарачыя староннікі і прапагатары веры ў самих сябе і свой Народ, пачынаюць флірт з тымі, хто не прызнае ня толькі незалежніцкай думкі, але запярэчваюць самому праву нашага Народу на назоў беларускі...

Чакаць чагосьці іншага ад верхаводаў сельсаюзу, даўно ўжо па праўдзе так далёка адбегшаму ад сялянства, што цяперака застаўся толькі адзін пусты назоў — няма чаго. Імёны і асобы гэтых верхаводаў гавораць самі за сябе.

Аднак абавязкам нашым зьяўляецца перасьцярагчы беларускае грамадзянства перад безумоўна шкадлівымі для нашага руху пачынаньнямі сельсаюзу. Ужо прыклад на выбарах у Віленскі гарадзкі самаўрад паказвае, што гэтыя пачынаньні дадуць нам, беларусам. Як ведама ў выніку выбараў у Вільны сьпісак зладжанага Ярэмічам беларуска-расейскага блёку — атрымаў адзін мандат. Канешна расейцы не дапусьцілі беларуса на першае мейсца. І на чале сьпіску зьмешчаны быў „бѣлорусскій" сэнатар Багдановіч. Які гэта беларускі сэнатар — відаць хоць-бы з таго, што за 5 гадоў сэнатарстваваньня ён гэту сваю беларускасьць ня выявіў. Народ, выбраўшы яго — на'т ня бачыў, як ён выглядае. Ведамы ён усім, як „сэнатар ад спраў царкоўных", якія вядзе ў такім выразна расейскім духу, што расейцы зусім слушна лічуць яго выключна сваім, расейцам.

[illegible]і галасавалі і беларусы. Гэткім [illegible] [illegible]енскі самаўрад *галасамі і беларус[illegible]ў* — трапіў расеяц, прадстаўнік тых, якія не прызнаюць ніякіх беларусаў.

Другая ярэмічаўская спроба аліянсу з расейцамі — гэткі-ж як у Вільні блёк пры выбарах у Гарадзенскі самаўрад — вышаў сусім няўдалы: сьпісак блёку не атрымаў ані воднага мандату. Ясна чаму: у Горадні беларусаў куды больш, чым расейцаў. Горадзенскія беларусы — элемэнт сьвядомы нацыянальна. Яны расшыфравалі нягодную работу і не пайшлі на зазываньні блёку.

Пацярпеўшы у Горадні поўнае фіяско з сваімі імкненьнямі да усіленьня сваіх шансаў на выбарах апорай на расейцаў, ура — незалежнік ня выцягнуў з гэтага ніякага дасьведчаньня.

Як падаюць газэты — ён надалей хлапоча аб утварэньні ўжо фармальнай, на шырокіх падставах „16-кі" на выбары у Сойм. Чым гэта пахне, для нас зусім зразумела. „16-ка" 1922 г. страціла адзін мандат на Навагрaдчыне: з 4 мандатаў жыды захапілі ажно 2, хоць па ліку іхніх галасоў — ім ніяк больш аднаго не выпадала.

Але то-ж была „16-ка", кіраваная Луцкевічам, як ніяк разумным, спрытным і дасьведчаным дзеячом. Можна сабе па гэтаму прыкладу ваабразіць, якія вынікі будуць з „16-кі", Ярэмічам склеенай і кіраванай!...

Зусім зразумела, чаму Ярэміч і яго кліка імкнуцца да тварэньня „16-так". Уся іх дасюлешняя праца выказала іх поўную няздольнасьць да пазытыўнай працы. „Высокая палітыка" — збанкрутавала. Шукаючы выхаду, яны кідаюцца то ўправа, то ўлева Самі яны разумеюць, што з тупіка, у які залезьлі — няма выхаду. Дэмагогія лёзунгаў, гучная фразэалёгія, назоў „сялянскі саюз"— адны ня вывязуць. Сяляне маюць права запытаць: а што-ж вы, паночкі, зрабілі за 5 гадоў пасляваньня? Чаму за гэтыя 5 гадоў ня былі ласкавы зьвязацца арганічна з вёскай, увайсьці у гушчу народную, жыць жыцьцём і інтэрасамі гэтага Народу, а не займацца „высокай палітыкай", у якой вы самі утоплі з вушамі?

Забойчыя пытаньні! Што на іх адкажаш? На вёску гэткім чынам стаўка ня пэўная. А мандат пасольскі — надта смачная рэч: варта паклапаціцца.

І вось у гэтым, — у шуканьні мандацікаў за ўсялякую цану, у затрыманьні у сваіх руках, хоць і самазванна, тытулаў кіраўнікоў Беларускага Народу, а галоўнае— пасольскіх незачэпнасьці, дыетаў і іншых дабрадзействаў — адзіная падстава шуканьня Ярэмічамі паразуменьня нат з ворагамі.

Вёска ня пэўная... А мо горад вывязе? Вось лейт-матыў сучасных „шаснаццаткавых" заходаў...

Нам здаецца аднак, што Народ наш разгадае істоту імкненьняў лаўцоў мандатаў за уселякую цану і дасьць ім і іхняй нягоднай рабоце той адказ, які яны атрымалі ўжо у Горадні.

Нельга у імя сваей кар'еры аддаваць у чужацкія і варожыя рукі лёс беларускага нацыянальнага вызваленьня!

З жыцьця нашых арганізацыяў.

БЕЛ. НАЦ. РАДА і ПАРТЫЯ.

Старшыня п. Паўлюкевіч гэтымі днямі выехаў у справах Рады і Партыі на правінцыю на некалькі дзён.

Справа аб Мураванскай Царкве Лідзкага павету рушыцца і на добрым шляху. Есьць надзеі, што ў хуткім часе Царква будзе адчынена. Справа аб вольна-слухачах у віленскім унівэрсытэце, якія не маюць матуры, ваяводзтвам парушана і чакаецца адказ ад Міністэрства Асьветы.

„ПРАСЬВЕТА"

На канфэрэнцыю старшынь Гурткоў „Прасьветы", якая адбудзецца ў Ушы 15-га г. м., выехаў сябра Цэнтр. Ураду „Прасьветы" п. Тодар Вярнікоўскі, адтуль у справах „Прасьветы" паедзе да Маладэчна і Вялейкі.

Сэкрэтар Цэнтр. Ураду „Прасьветы" п. М. Станкевічанка па аб'ездзе Валожынскага павету вярнулася ў Вільню.

Створаны і паўсталі да жыцьця новыя Гурткі „Прасьветы" ў Валожынскім павеце, а ласьне: ў Трабах, Яраціпшках, Вішневе, Гародзьках і Шыпулічах.

Бібліатэкі і газэты ў чытэльні новых гурткоў на днях высылаюцца. Большасьць сяброў Вішнеўскага Гуртка „Інстытута Гаспадаркі і Культуры" перайшлі ў „Прасьвету".

Справа аб'езднага тэатру і кіна Лебедзеўскага Гуртка „Прасьветы" на добрым шляху. Ваяводзтва адняслося прыхільна і канцэсія будзе выдадзена на гэтых днях. Старшыня Лебедзеўскага Гуртка „Прасьветы" Тодар Сьвірыд, ён-жа арганізатар гэтай справы — ўжо шыкуецца да аб'езду.

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

У Заходняй Эўропе наступіла каранная зьмена ў паглядах на камунізм наагул і на радавую ўладу ў Расею ў прыватнасьці. Калі у першы час панаваньня радавай улады ў Расеі расейскія эмігранты, уцёкшыя з Расеі з пад шыбеліцы ці „сьценкі" чрэзвычайкі, крычэлі на ўвесь сьвет аб зьверстве бальшавікоў, дык ў Эўропе ніхто не хацеў гэтаму верыць. Нават буржуазная прэса больш зьвяртала ўвагі на пытаньне аб магчымасьці палажэньня „добрых, палітычных і гандлёвых адносінаў" з бальшавікамі (Л. Джордж нават сказаў, што і з людажэрцамі можна гандляваць), чым на разьдзіраючы душу крык расейскай эміграцыі аб бальшавіцк м тэроры. І калі-б толькі бальшавікі ня былі бальшавікамі, гэта значыць, калі-б яны абмежаваліся толькі уладаньнем аднэй Расеі і ня імкнуліся да распаўсюджаньня сваей камуністычнай ідэі на увесь сьвет, — яны маглі-бы сьмела разлічаць на добрыя адносіны з боку буржуазнага Захаду. Нават балей таго, чым больш рэакцыйная сыстэма уладаньня пэўнай дзяржавы, тым лепшыя укладаліся адносіны яе з радамі. „Культурны" Захад перaступіў-бы праз труп мільёнаў загубленых бальшавікамі нявінных расейскіх ахвяраў і з спакойным суменьнем да гэтай пары „гандляваў-бы" з бальшавікамі. Але часовы пасьпех камуністычнай агітацыі у Азіі, у эўрапэйскіх калёніях, у Афрыцы і у самай Зах. Эўропе паказаў камуністычную небясьпеку перад Захадам у поўным абліччы.

Паволі пачаў зьмяняцца пагляд на істоту бальшавізма, які у пачатку лічыўся выключна расейскім зьявішчам.

Аказваецца бальшавізм яшчэ з большым пасьпехам разьвіваецца сярод больш культурных народаў, чым сярод малакультурных. Дзесяць гадоў істнаваньня радавай улады у Расеі зусім расеялі лягэнду аб спэцыфічна-расейскім характары бальшавізму, прадставіў яго, як найбольшую агульна-сьвятовую небясьпеку. І цяпер заўважаецца зусім адваротнае зьявішча, чым пяць — дзесяць гадоў таму назад: цяпер акурат тыя элемэнты, якія раней стаялі за зблізкэньне з радавай Расеяй, за ўзнаўленьне дыплёматычных і гандлёвых адносінаў з ею, зьяўляюцца найбольшымі ворагамі бальшавізму, Цяпер высунуты заходняй буржуазыяй новы лёзунг:

байкатаваньне, блякада і ізаляваньне радавай Расеі.

Ні англійскія, ні францускія, ні нават нямецкія фінансістыя і прамыслоўцы ня хочуць выдаваць бальшавікам пазыкаў і гандляваць з імі на роўных варунках з іншымі дзяржавамі. Цяпер буржуазная прэса Заходняй Эўропы больш запоўнена бальшавіцкімі зьверствамі ў Расеі, чым расейскія эміграцкія газэты. І адкуль узялася дакладная знаёмасьць з варункамі цяперашняга жыцьця у Расеі?! Раней бальшавікі ставілі адным з галоўных варункаў пры ўзнаўленьні гандлёва-дыплёматычных адносінаў з якой-небудзь дзяржавай — ліквідацыю расейскіх эміграцкіх арганізацыяў і іх друкаваных ворганаў, лічучы іх галоўнымі вінавайцамі зблізкэньня з Зах. Эўропаю. Цяпер-жа няма патрэбы бальшавікам рупіцца аб спыненьні за граніцаю антыбальшавіцкай эміграцкай агітацыі, бо ўвесь баржуазны Захад, уся буржуазная заходняя прэса вядзе самую энэргічную агітацыю проці расейскага бальшавізму, як найбольшай небясьпекі сучаснай цывілізацыі. Англійскія, францускія і амэрыканскія найбольш уплывовыя часопісі, расходзячыяся ў мільёнах экзэмпляраў, распаўсюджаць гэтую ненавісьць да бальшавізму па усяму сьвету, нават там, дзе яшчэ не здалела прасачыцца бальшавіцкая зараза. У дзесятыя ўгодкі сьвяткаваньня „кастрычніковай рэвалюцыі", да якога бальшавікі рыхтуюцца з вялікаю помпай, гэта зьявішча прыпомніць ім, што іх дні панаваньня ў Расеі пералічаны. Бальшавізм ідзе ня ўперад, а назад. Можа гэты працэс адбываецца вельмі паволі, ня гэтак, як бы нам хацелася, але правідлова і няўнікнёна прывядзе нарэшце да поўнай ліквідацыі ня толькі бальшавіцкіх уплываў за граніцаю, але і бальшавізму у Расеі.

Але ў той час, як пад бальшавіцкім пытаньню можна было-бы перайсьці да дзеннага парадку, Зах. Эўропу раптоўна заалярмавалі два канфлікты, адначасна выбухнуўшыя на двох проціўлежачых пунктах, гэта—

балканскі і літоўска-польскі канфлікты.

Балканы прадстаўляюць быццам агнядышачы вулкан, які часамі гасьне, то зноў выбухае. Яны былі безпасрэднюю прычынаю векавой барацьбы царскай Расеі з Турцыяй і нават з Англіяй, Францыяй і Італіяй (Крымская вайна); яны выклікалі апошнюю сьятовую вайну і вось ужо некалькі разоў пагражалі выбухам новай вайны. Новым чыннікам, пабуджаючым Балканы да новай вайны, зьяўляецца фашыстаўская Італія, якая імкнецца пашырыць сваю экспансыю на Усход. Італія, як ведама, задыхаецца ад збытку насяленьня. Італьянскія работнікі перапоўнілі француск работніцкі рынак, амэрыканскі і цяпер шукаюць новых тэрэнаў для эміграцыі. А Балканы і Блізкі Усход ласьне і прадстаўляюць найбольш памысны тэрэн для італьянскай эміграцыі. З-за гэтага у пачатку бягучага году ледве ня выбухла вайна Італіі з Турцыяй а затым Італіі з Юга-Славіяй, якую удалося запабегчы, дзякуючы інтэрвэнцыі Англіі, Францыі і Нямеччыны. Тады Мусаліні дзеяў праз Албанію, падпаўшую пад поўную залежнасьць ад Італіі, а цяпер праз Боўгарыю. Безпасрэднюю прычынаю цяперашняга балканскага канфлікту зьяўляюцца правакацыйныя напады на югаславянскую і грэцкую тэрыторыю баўгарскіх гэтак званых „камітаджаў". Гэта звычайныя македонскія вааружоныя банды, за дзейнасьць якіх ня хоча на сябе браць адказнасьці баўгарскі урад, тлумачучыся, што яны прадстаўляюць аднолькавую небясьпеку і для Баўгарыі. Але гэта не ёсьць так запраўды. У выніку апошняй вайны, як ведама, Македонія падзеляна між Баўгарыяй, Юга-Славіяй і Грэцыяй. І Баўгарыя ня траціць надзеі зноў злучыць гэтыя часткі Македонцаў пад сваей гегемоніяй. Гэткім чынам Македонія прадстаўляе тую бочку з порахам, якая лёгка можа выбухнуць у паветра ад кінутай палячайся сярнічкі. І раней карысталіся македонскімі камітаджамі бальшавікі для сваіх рэвалюцыйных мэтаў, пакуль гэта ня стала небясьпечным для самой Баўгарыі, а цяпер замешана у гэтым рука Мусаліні.

Каб выклікаць збройны канфлікт на Балканах, адначасна, як па загаду, пачаліся ў Грэцыі і Юга-Славіі бомбавыя замахі македонскіх тэрорыстаў і збройныя напады баўгарскіх македонцаў на тэрыторыі Грэцыі і Юга-Славіі. Зусім зразумела, што адказнасьць за гэта нясе Баўгарыя, на тэрыторыі якой пляну[illegible]юцца і арганізуюцца гэтыя бандыцкія і тэрорыстычныя банды. Палітычная сытуацыя на Балканах гэтак напружана, што некаторыя з часопісаў параўняюць нават з 1914 г. Юга-Славія зусім закрыла сваю граніцу з Баўгарыяй, а юга-славянскае пасольства зл[illegible]жыла свае рэчы і гатова кожную хвілю пакінуць баўгарскую сталіцу. Але німа паважных прычынаў, баяцца за лёс міра на Балканах, на стражы якога стаіць Ліга Народаў і Францыя з Англіяй, якія ня менш Італіі зацікаўлены лёсам Балканаў.

Гэтак сама няма ніякіх прычынаў баяцца асл[а]жненьня польска-літоўскага канфлікту, у якім, відочне, гэтак сама замешана староньняя рука. Польска-літоўскі канфлікт выбух, як ведама, на грунце прасьледаваньня літоўцамі польскага школьніцтва на Літве. І тут як у Балканскім канфлікце, цікава тое, што ён раптоўна выбух пасьля візыты літоўскага прэм'ера Вальдэмараса у Мусаліні і ў Бэрліне, адкуль вядуць ніткі усіх інтрыгаў на „Новых Балканах" — у Прыбалтыцкіх рэспубліках. Польскі урад адказаў на гэты вызаў з боку Літвы энэргічнымі контр-мерамі. Закрыў амаль усе прыватныя школы літоўскага таварыства „Rytas" і арыштаваў некалькі дзесяткаў літоўскіх палітычных дзеячоў, сярод якіх шмат ксяндзоў. А затым прыезд да Вільні Маршалка Пілсудзкага з радаю міністраў у зьвязку з угодкамі звальненьня Вільні з пад літоўска бальшавіцкай улады павінен ас[ту]дзяняюча уплынуць на разгарачаныя галовы літоўскіх шовіністаў, скачучых з запаленымі факеламі над парахавым склепам.

N.

Маршалак Я. Пілсудзкі ў Вільні.

СПАТКАНЬНЕ.

Прыбыўшага ў Вільню ў нядзелю а 8 г. рана Маршалка Пілсудзкага на чале Рады Міністраў спатыкалі на вакзале Ваявода п. Рачкевіч, быўшы ў Вільні міністар унутраных справаў гэн. Складкоўскі, прэзыдэнт места Фолейеўскі, віцэ-міністр ваенных справаў гэн. Конаржэўскі, шэф Д. О. К. III гэн. Літвіновіч, прадстаўнікі духавенства, акадэміцкі сэнат і прадстаўнікі рады грамадзкіх арганізацыяў.

ВАЕННЫ ПАРАД.

Пасьля набажэнства ў Катэдральным касьцелі адбыўся на катэдральным пляцу парад войска Віленскага і Нова-Вялейскага гарнізону.

КАНФЭРЭНЦЫІ.

А першай гадзіне дня ў рэпрэзэнтацыйным палацу пад кіраўніцтвам Старшыні Рады міністраў Я. Пілсудзкага адбылася канфэрэнцыя пры ўдзеле міністраў Складкоўскага, Дабруцкага, Кноля, Лукасэвіча, ваяводы Рачкевіча, шэфа ваеннага кабінэту палк. Бэка і дырэктара дэпартамэнту Сьвітальскага.

А 6 г. у Маршалка Пілсудзкага адбылася другая канфэрэнцыя ў якой апрача вышэй вылічаных асобаў прынялі ўдзел пракурор апэляцыйнага суда Пешчынскі, пракурор акружнога суда Стэймс, куратар школьнага вокругу Рыневіч, начальнік К. О. Р. палк. Гурскі, начальнік аддзелу бясьпекі Кіртыкліс і камэндант ваяводзкай паліцыі Прашаловіч.

АУДЫЕНЦЫІ ў МАРШ. ПІЛСУДЗКАГА.

У папалудневых гадзінах Маршалак Пілсудзкі прыняў на аудыенцыі ў рэпрэзэнтацыйным палацу япіскапа Міхалькевіча, польскага пасланніка ў Рызе Лукашэвіча і дэлегацыі ваенных арганізацыяў. Затым Маршалак Пілсудзкі меў канфэрэнцыю з ваяводай п. Рачкевічам па палітычным і адміністрацыйным справам Віленскага ваяводзтва.

АБЕД У ВАЯВОДЫ п. РАЧКЕВІЧА.

А 7 г. вечара ваявода п. Рачкевіч выдаў абед у чэсьць Маршалка Пілсудзкага і прыбыўшых з Варшавы высокіх гасьцей, на які былі запрошаны вышэйшыя прадстаўнікі мейсцовай улады і духавенства.

Р А У Т.

Вечарам прэзыдэнтам места п. Фолейеўскім быў выданы ў Доме Польскага Афіцэра раут у чэсьць высокіх дзяржаўных дастойнікаў, на які былі запрошаны прадстаўнікі духавенства і прэсы. Ад беларускіх арганізацыяў адтрымалі запрашэньні і былі прысутнымі старшыня Бел. Нац. Рады і Партыі п. А. Паўлюкевіч, рэдактар „Беларускага Слова“ п. Т. Вярнікоўскі, рэдактар „Бел. Дня“ п. Ф. Умястоўскі і старшыня Варшаўскага Беларускага Камітэту п. Л. Дубійкоўскі.

А Д‘ Е З Д.

А 10 г. Маршалак Пілсудзкі прыбыў на аўтамабілі на пекна ілюмінаваны вакзал. На вакзале чакалі прыбыцьця Маршалка міністры Дабруцкі і Станевіч, ваявода Рачкевіч, начальнік III Округа-корпусу гэн. Літвіновіч, начальнік дывізыі гэн. Паповіч з корпусам афіцэраў і прадстаўнікі ўлады. Пад гукі музыкі Маршалак прайшоў перад фронтам ганаровай кампаніі і вайшоў у цягнік. А 22 г. 35 м. пад гукі аркестру, адыграўшага нацыянальны гімн, Марш. Пілсудзкі выехаў да Горадні. Гэтым самым цягнікам выехалі да Варшавы мін. Дабруцкі, Станевіч і ваявода Рачкевіч.

МАРШАЛАК Я. ПІЛСУДЗКІ ў ГОРАДНІ.

Ноч з 10 на 11 кастрычніка Маршалак Пілсудзкі правёў у сваім вагоне на станцыі Горадня. Меў 1½ гадз. канфэрэнцыю з міністрам унутраных справаў Складкоўскім, дырэктарам палітычнага дэпартамэнту Сьвітальскім і ваяводаю Гэмбоўскім. Затым пасьля пасьвячэньня Д. О. К. а 12 г. выехаў да Варшавы.

Апошнія навіны.

З ПОЛЬШЧЫ.

Падпісаньне амэрыканскай пазыкі.

Пасьля надзвычайнага паседжаньня 12 кастрычніка Рады Міністраў у Бэльвэдэру віцэ-мін. Бартэль заявіў прадстаўнікам прэсы, што ўрад рашыў падпісаць акты пазыкі дзякуючы згодзе амэрыканскіх банкаў на прапанаваныя варункі. У той-жа дзень былі паведамлены аб гэтым прадстаўнікі амэрыканскіх фінансістаў Фішэр і Манэ. 13 кастрычніка п. Фішэр і Манэ пасьля паразуменьня з сваімі мацадаўцамі шляхам радыо заявілі мін. скарбу Чэховічу, што упаважнены да падпісаньня ўсяго пазычковага дагавору. Дзеля гэтага пазыка была падпісана 13 і 14 кастрычніка.

Варункі пазыкі наступныя: Эмісыйная цана 92. Аблігацыі будуць выпушчацца з датаю эмісыі 15 кастрычніка 1927 г. Амартызацыйны фонд, патрэбны для выкупа ўсей эмісыі ў тэрміне яе платнасьці, будзе складаць у працягу першых 4 г. 4 проц. ад сумы выкупу пазыкі, складаючай 103 проц. ад сумы капітальнай і будзе узрастаць на ½ проц. праз кожныя 4 г. Апрача гэтага Польшчы пазастаўлена права датэрміновага выкупа пасьля 10 гадоў па курсу 103. Належыць адцяніць, што гэткага курсу выкупу не адтрымала да гэтуль ніводная з эўропэйскіх дзяржаваў. Напр. Нямеччына і Бэльгія маюць па 105. Адначасна трэба адцяніць факт, што кіхто дагэтуль не адтрымаў права датэрміновага выкупу. Агульная сума пазыкі дасягае 62 мільёны даляраў і 2 мільёны фунтаў штэрлінгаў, што разам складае 72 міл. ф. шт.



МАРШАЛАК Я. ПІЛСУДЗКІ.

ВЫНІКІ ВЫБАРАУ У ГАРАДЗЕНСКУЮ МЯСТОВУЮ РАДУ.

У нядзелю 10 кастрычніка адбыліся выбары да Горадзенскай мястовай рады. Было выстаўлена 15 сьпіскаў, з якіх два беларускіх: № 11 беларуска расейскі камуністычны і № 12 беларуска-расейскі (Сель Саюзьнікі Ярэміч-Рагулі). Вынікі выбараў наступныя: P. P. S. — 4 мандаты, жыдоўскі Бунд — 3, жыдоўскі Поалей Сіон — 1, камуністыя —5, жыдоўскі нацыянальны блёк — 13, Польская эндэцыя — 9. Як грамадоўцы, гэтак сама і Сель-Саюзьнікі ў хаўрусе з расейцамі не адтрымалі ні воднага мандату. Мела права галасаваньня 23,916 асоб, з якіх 12,231 хрысьціян і 11,685 жыдоў. Прыняла ўдзел у галасаньні каля 15,000 асоб, што складае каял 60 проц.

ВЫНІКІ ВЫБАРАУ У ЛОДЗІ.

Вынікі нядзельных выбараў у Лодзінскую мястовую раду наступныя: нямецкія сацыялісты— 7 мандатаў, P.P.S.—21, Ch. D.—6, Бунд - 6, Поалей-Сіон—3, уласьнікі нярухомасьці на акраінах—2, інваліды— 1, нямецкае аб'еднаньне — 3, рэлігійныя жыды - 1, рамесьлянікі — 4, блёк гаспадарчых працаўнікоў — 1, жыдоўскія дэмакраты — 1, польскі выбарчы камітэт — 3, жыдоўскія артадоксы — 4, сіяністы — 4. Меўшых права галасаваньня было 315,847, галасавала—242,869 ці 76%. Правідловых галасоў прызнана 200, 758, неправідловых — 42,111

Скандальны правал беларускарасейскага хаўрусу у Горадні.

Паны Ярэміч і Рагуля пасьля нефартуннага выступленьня разам з расейцамі на віленскім бруку пры выбарах да мястовай Рады і поўнага правалу на выбарах у гмінныя самаўрады, хацелі адыграцца хоця ж на выбарах ў мястовую раду ў Горадні.

І вось быў створаны „расейска-беларускі“ блёк па прыкладу віленскага, „расейска-беларускі аб'яднаны выбарчы камітэт“ у складзе 4 асоб, выстаўлен выбарчы сьпісак № 12 з 14 кандыдатамі...

У нядзелю 2 кастрычніка, за тыдзень да выбараў, быў наладжаны мітынг у салі б. „Мадэрн“, на якім выступалі з агітацыйнымі прамовамі віленскія гастралёры Ярэміч, сэн. Назарэўскі і сэн. Багдановіч.

„Сял. Ніва“ (№ 73) ад суботы 8 кастрычніка зьмясьціла адозву з тлумачэньнем заданьняў „блёку“ і заклікам галасаваць за сьпісак № 12. Словам — усё было пастаўлена на ногі, ўсе былі націснуты пружыны і кнопкі „сельсаюзьніцка-расейскага блёку“, каб здабыць хоць адзін мандацік у горадзенскай мястовай радзе... А у выніку выйшла... хамут і дышла... Два 00 — адзін па сьпіску № 12, а другі — № 11 (сьпісак беларуска-расейскай інтэлігэнцыі). Вынікі катастрафічныя: **аніводнага мандаціку.**

А здаецца шчасьце было гэтак блізка, гэтак магчыма...

ПАЗЫКА НА АДБУДОВУ ВІЛЕНШЧЫНЫ.

У часе сваей апошняй паездкі да Варшавы п. Ваявода Рачкевіч меў канфэрэнцыю з старшынёю Банка Госп. Кр. гэн. Гурэцкім у справе пазыкі для Вільні і Віленшчыны, неабходнай для падняцьця гаспадарчага жыцьця краю. Гэн. Гурэцкі абецаў доўгатэрміновую пазыку ў 300,000 зл., якая можа быць выкарыстана на адбудову Віленшчыны, апрача гэтага 700,000 для Вільні і 200,000 залатых злотых для Віленска-Троцкага павету.

З ЗАГРАНІЦЫ.

КАНФЭРЭНЦЫЯ МІН. ЗАЛЕСКАГА З БРЫЯНАМ І ЧЭМБЭРЛЕНАМ.

Да Парыжу прыехаў пасьля спатканьня з гішпанскім дыктатарам Прыма-дэ-Рывэра англійскі мін. заграні́чных справаў Чэмбэрлен і ў той жа дзень гутарыў з Брыянам. Да Парыжу заехаў гэтак сама і Польскі міністар заграні́чных справаў Залескі. Мяркуюць, што яго гутарка кранецца ўсіх пытаньняў палітыкі Усх. Эўропы і ў першую чаргу ўзаема адносінаў між Польшчай і Літвою. Англійскае міністэрства быццам вельмі заклапоча-

Лермантаў па беларуску.

(Крыху увагаў аб першым беларускім перакладзе „Дэмона“).

У № 21-ым „Беларускага Слова“, даючы у артыкуле *„Сярод кніжак“* агляд віленскіх беларускіх выдавецтваў за 1926 год, мы ўспаміналі, між іншым, ў агульнай форме, і аб поэме Лермантава *„Дэмон“* у перакладзе Макара Краўцова, які раней пераклаў і іншую яшчэ поэму гэтага-ж песьняра: *„Мцыры“*.

Дзеля таго што *„Дэмон“* належыць да архітвораў сусьветнае літэратуры, пераклад ягоны заслугоўвае на асобую увагу і павінен быць разгледжаным дэтальна.

Бяручы агулам, пераклад М. Краўцова ёсьць зусім удачны: мова — даволі чыстая, верш — гучны, разьмер—захаваны, зьмест — набліжаны да арыгіналу, аднак побач з гэтым, ёсьць ў ім і *паважныя бракі*, якія вельмі псуюць гэты добры пераклад, дзеля чаго павінны быць ухілены перакладчыкам у новых выданьнях. На гэтых недахопах і спынімся мы прадусім у нашым аглядзе, адцемліваючы адначасна і найбольш удалыя мейсцы перакладу.

Вось-жа самы пачатак поэмы выйшаў добра:

„Пануры Дэмон, дух выгнаньня
„Лятаў над грэшнаю зямлёй;
„І дзён інакшых спамінаньне
„Прад ім ляцела грамадой —
„Тых дзён, калі ў будынку сьвету
„Ясьнеў ён, чысты хэрувім,
„Калі ляцеўшую камэту
„Ласкавым вокам агняцьвету (?)
„Віталі ангелы ўсе з ім; “.....

але і тут 3 апошнія строфы, відаць *у мэтах большага філёлёгічнага унезалежненьня ад расейскага арыгіналу*, бо даволі трудна тутака дагледзіцца нейкіх вэрсыфікацыонных труднасьцяў, — перакладзены лішне ўжо вольна без сапраўднае патрэбы, бо калі гэткае унезалежаньне прынцыпова і ёсьць пажаданым, дык імкнуцца да яго трэ' не шляхам адыходу ад тэксту, а прадусім праз падбор характэрных, беларускіх слоў.

Акрамя таго поўнай навасьцяй ў гэтай краіне зьяўляецца „адкрыцьцё“ перакладчыка, што ангелы маюць вочы агняцьвету, аб чым д а с ю л ь неяк ня было чутно; шкада толькі што гэта цікавая „рэвалюцыя“ змахівае крыху на звычайны „набор слоў“, ўжыты з мэтай змайстраваньня п а т р э б н а е рыфмы! Ў арыгінале ўся гэта справа выглядае шмат скрамней і... прыгажэй, а ласьне:

„Когда бѣгущая комета
„Улыбкой ласковой привѣта
„Любила помѣняться с ним;“

Н а д т а - ж *цікаўна і сакавіта* пераклаў М. К. пачатак знамянітага адрыўку: *„И над вершинами Кавказа“*. (Глава III-цяя часткі І-шай):

„І над вершынамі Каўказу
„Выгнанец раю нек ляцеў,
„Пад ім Казьбек, як-бы з алмазу,
„Адвечным сьнегам зіхацеў.
„І для вачэй яго прынада,
„Ўнізе нарой, будынкам гада,
„Чарнеў, круціўшыся Дар'ял,
„Ды Тэрэк, пруткі як лявіха,
„З кудлатай грывай на хрыбце,
„Роў паддзыгаючы...

Далей ўжо справа выглядае горш, — бо, пачынаючы з гэтага мейсца, пераклад псуецца і перакладчык пішучы:

„..... І ціха,
„Кругі рабіўшы ў высаце
„Зьвяры (?) і птушкі яго чулі,
„І залатыя аблакі
„На поўнач шлях тае ракі
„З краёў паўдзёмных пацягнулі (?)“.

выразна мінаецца са здоровым сэнсам, бо са слоў гэтых выходзіць, што ня толькі птушкі але і зьвяры кружылі ў паветры, а воблакі вызначылі кірунак рацэ, тымчасам у арыгінале німа і сьледу гэткага пагвалчаньня непарушных правоў прыроды, бо аўтар кажа толькі наступнае.

„..... И горный зьвѣрь и птица,
„Кружась в лазурной вышинѣ,
„Глаголу вод его внимали;
„И золотыя облака
„Из южных стран, издалека,
„Ею на сѣвер провожали“.

Гэтак-жа скалечыў сэнс перакладчык і ў канцы гэтае главы, кажучы:

„І дзікі й дзіўны быў там рух (?)
„На цэлы сьвет“....

калі ў арыгінале чытаем :

„И дик, и чуден был вокруг
„Весь Божій мір!“...

У главе IV-ай, пасьля слоў „пяюць красуньняў“, прапушчана надта-ж важная коска, без якое гэты адрывак губляе увесь сэнс!

У главе V-ай слова „лятае“ (на ступенях), у адносінах да Тамары, ходзючай з вадой да Арагвы зьяўляецца крыху вульгарным; лепш было-б ужыць тут слова „мільгае“, якое, акрамя таго будзе бліжэй і да арыгіналу, дзе сказана: „мелькая“.

Вось даволі добра выйшла глава VII-ая; вось яе пачатак

„Бажуся поўначы зарой,
„Праменьнем захаду і ўсходу,
„Ўладарнік Пэрсіі і той,
„Дый на'т ніхто з людзкога роду,
„Як-бы ні быў між нас высока,
„Не цалаваў такога вока“.....

За тое ў пачатку главы IX-ай перакладчык ізноў дасадна скалечыў сэнс, кажучы аб Дэману што:

„Нямой душы яго пустыню
„Тук (?) дабрадзейны закрануў“.....

тады калі у арыгінале ясна сказана:

„В нѣмой души его пустыню
„Проникла молніей любовь“.

У канцы, агулам добрай, главы XI-ай ізноў у ахвяру рыфме прычесены перакладчыкам здаровы сэнс, бо тады, калі у арыгінале, чытаем аб князе Сінадалу што ў яго:

„В рукѣ сверкнул турецкій ствол“

у перакладчыка бачым несуразнае:

„А руля (!) бліс тады, бы кол (?!)“

Калі гэта кол блішчэў бы руля (ствол) ружжа?!!..

У главе XIV ізноў у канцы скалечаны сэнс!

Замест слоў арыгіналу:

„Не долго жениха младого,
„Невѣста взор твой ожидал!“

чытаем:

„Ня доўга ўбачыць маладога
„Пагляд твой дзеўчына хацеў...“

У главе XV-ай даволі добра перакладзена ведама адрывак; *„Не плачь дитя“*, за тое ня менш папулярны наступны *„На воздушном океанѣ“*, павярхоўна здавальняючы, выяўляе пры бліжэйшым знаёмстве рад недахопаў ў І-ай палове яго; а ласьне чытаем:

Раяшнік.

Вось „Сялянская Ніва“, — што цяпер ужо ня дзіва — ў Горадню ўсё заклікала: беларусоў з маскалямі яднала, але на ўвесь гэты шык — выйшаў адзін толькі пшык...

Не памаглі на‘т сэнатары — да мандатаў так сама аматары, бо як газэты ўжо прынясьлі — падвялі „господа“ маскалі...

І ніхто як свой — „россіянин родной“!...

Так-та, паночкі, сэнат — галубочкі!...

І ў Вільні ўжо тутака і ў Горадні там, а мандаты трашчаць па ўсім „швам“!...

А на беларусаў надзеі няма ўжо калі, дык не памогуць і „господа“ маскалі!...

А „Нашая Праца“ вось дзякуй Богу — пайшла ў старую дарогу...

Цярністаю—гэтак званаю „грамадзістаю“..

Клопаты для адміністрацыі — дый газэты канфіскацыі... Пасля дапросы, суды—і ўцякай—хто куды...

А каб менш сацыяльнага, дык больш нацыянальнага, ды стаўка была-бы пабіта і сталася-б справа зусім прызваіта...

Бо „гурткі“ хоць і спалі, але прабуджаюцца, да нацыяналістаў ўжо далучаюцца, і сам сабе той ўжо пашкодзе, хто будзе таму ў перашкодзе ..

А выбарчыя камбінацыі парушаюць ўсе арганізацыі і на‘т палякі да сьвятога Лукі *) забракалі пана Антона..

Каб больш ня крычэў ён з амбона свайго нацыянальнага, ў кірунку III-га інтэрнацыянальнага..

Шэйнэ-Катарынка

*) Турма на Лукішках.

на канфліктам між гэтымі дзяржавамі, ідучым на карысьць радаваму ўраду. Прыезду Чэмбэрлена і Чэрчыля прыпісваюць вялікую вагу ў зьвязку з француска-радавым канфліктам.

ЛІКВІДАЦЫЯ БАУГАРСКАГА КАНФЛІКТУ.

З Белграду паведамляюць на падставе афіцыяльных англійскіх крыніцаў, што між Белградам і Сафіяй дасягнута паразуменьне адносна аканчальнай ліквідацыі пытаньня аб камітаджах.

МАКДАНАЛЬД ПРОЦІ РАДАУ.

На канфэрэнцыі работніцкай партыі ў Блекпуле Макданальд кануў англійска-радавыя адносіны і між іншым сказаў: „усім тым, хто заўсёды гаворыць аб патрэбе абароны радавай Расеі, павінен заявіць, што найгоршаю абаронаю радавай Расеі зьяўляецца пабляжлівае трактаваньне міжнарадовай палітыкі, якую Расея вядзе. Яна не зрабіла ніякіх крокаў, каб наладзіць добрыя адносіны з эўропэйскімі дзяржавамі Апрача многалічных спробаў, робленых у гэты кірунку, не ўдалося да гэтай пары адтрымаць ад Радавага ўраду задавальняючага адказу“.

РЭВАЛЮЦЫЯ ў МЭКСІЦЫ.

Паўстанчаскі рух у Мэксіцы не задушаны. Гэн. Гомэз не растрэляны, а знаходзіцца каля Вэра-Круз, дзе адтрымаў падкрапленьне ад гэн. Альмады. На правінцыі растрэляна 40 афіцэраў. У Торэні ўрадавыя вайскі вырэзалі шмат цывільнага насяленьня, У ночы з 9 па 10 кастр. растрэляна 2 гэнэралы і 13 афіцэраў. Апрача гэтага растрэляна 25 кіраўнікоў паўстаньня.

АДКАЗ СУЧАСНЫМ ПІРАТАМ.

З Каіру ў Эгіпце паведамляюць, што ў адказ на захоп бальшавікамі ў Чорным моры плыўшага пад эгіпецкім штандарам парахода „Коста“, эгіпецкі ўрад загадаў арыштаваць усе знаходзячыяся ў Суэскім канале радавыя параходы і дазволіць ім прадаўжаць плаваньне толькі тады, калі „Коста“ будзе зьвернуты Эгіпту.

Апрача гэтага эгіпецкі ўрад не дазволіў сайсьці з параходу прыехаўшым у Эгіпет радавым упоўнамочаным для пакупкі хлапку. З другога боку паведамляюць, што бальшавікі пастанавілі даць захопленаму параходу назоў „Сакко і Ванцэтті“.

УЗНАУЛЕНЬНЕ БАЕУ ў КІТАІ.

Нечакана падзеі ў Кітаі прынялі новы зварот. Цэнтр барацьбы перамясьціўся з Палудня на Поўнач. Войскі губэрнатара правінцыі Шансі, знаходзячыяся на Заходу ад Пэкіна, пачалі ваенныя дзействы і разьбілі каля Калгана армію Чанг-Тса-Ліна, якая пасьпешна адступіла ўдаўжкі жал. дарогі на Пэкін. Калі яны не затрымаюцца ў Нанкаўскім праходзе, дык Манчжурскі дыктатар можа ня здолець абараніць сталіцу Кітая і Пэкін можа быць здабыты прыхільнікамі палуднёвых і другам бальшавікоў Фэнгам і яго новым хаўрусьнікам губэрнатарам правінцыі Шансі. Гэта нечаканае наступленьне на Пэкін відочна было выпрацавана бальшавіцкім камісарам Бародзіным перад яго ад‘ездам у Маскву. Армія правінцыі Шансі налічае каля 170,000 чалавек. Чанг-Тса-Лін пасьпешна сьцягівае вайскі з Мандчжурыі. Ходзяць чуткі, што некатарыя з яго гэнэралаў здрадзілі. Гэткім чынам бальшавікам пашанцавала хвілева зноў павярнуць падзеі на сваю карысьць.

ПЕРАМОГА ЧАНГ-ТСА-ЛІНА.

Поўночная армія Чанг-Тса-Ліна разьбіла палуднёврю армію ля Калгана і захапіла да няволі 8,000 чал. Пасьля захопа Калгана поўночная армія зараз-жа перайшла да наступленьня, якое ідзе памысна. Гэткім чынам мінула небясьпека заняцьця кітайскай сталіцы Пэкіна палуднёвымі арміямі.

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ў ЭУРОПЕ.

Францускай газэта „Эграсінжан“ паведамляе з Цурыху, што комінтэрн у цяперашні час заклапочаны стварэньнем чырвонай арміі ў Эстоніі Літве, Польшчы, а так-жа і ў Англіі.

Нявэуная сытуацыя Літоускага Ураду.

З Коўны паведамляюць праз Гданьск, што дыктатура Вальдэмараса хістаецца. Урад баіцца новага пераварота. У зьвязку

Новая „шаснастка?“.

У зьвязку з надходзячымі выбарамі да новага Сойму і Сэнату, якія па чуткам маюць адбыцца ў канцы лютага наступнага году, нацыянальныя меншасьці заварушыліся. Зноў плянуецца блёк нац. меншасьцяў па прыкладу „16“ у 1922 г. Найбольшую рухлівасьць выяўляюць жыды, якія здабылі найбольш карысьцяў з „шаснасткі“. Дзеля гэтага яны цяпер выступілі першымі з ініцыятывай стварэньня гэткага блёку. Да гэтага блёку быццам ўвойдуць усе жыдоўскія партыі з вынікам артадоксаў і работніцкіх групаў, усе нямецкія партыі, якія ўжо стварылі „Нямецкі блёк“, літоўцы і славянскія нац. меншасьці. Галоўны ініцыятар ад жыдоў Рэйх, які вядзе гутаркі з украінцамі ў Львове, паведамляе, што быццам ужо падпісана умова з лідэрам украінцаў д-рам Ляўіцкім, на падставе якой „Ундо“ (Украінскае нац. аб‘еднаньне) згаджаецца ісьці супольна з жыдоўскім мяшчанскім блёкам. Што датычыць левых украінскіх арганізацыяў, дык яны пойдуць да выбараў асобна, ці створаць агульны фронт з камунізуючымі групамі.

Па чуткам каля гэтых арганізатараў новай „16“ блутаецца ад беларусоў і п. Ярэміч, які, страціўшы палітычны нюх і чуючы хістаньне грунту пад нагамі, кідаецца на ўсе бакі: то ён складае нейкія мэморыялы ў Варшаве, то блёкуецца з расейцамі на выбарах у віленскую і горадзенскую мястовыя рады, то нарэшце нюхаецца цяпер з жыдамі, творачых для сваіх карысьцяў „16“.

з гэтым зроблены перасуваньня войска: да Кашадараў высланы 5 полк пяхоты, да Таўрагэна — 7 і 8 п. пяхоты. Паліцыя мілітарызована. Саюзы шаўлісаў стаяць на пагатове. Усюды пануе нячуваны тэрор.

ПРАВАКАЦЫЙНАЕ ЗАБОЙСТВА СЭРБСКАГА ГЭНЭРАЛА.

Трыма нявыкрытымі спраўцамі, відочне макэдонцамі замардаваны гэн. Ковачэвіч, камандуючы вайскамі ў Іштыбе. Адзін з браўшых удзел у замаху Кролеў, які быў схоплены жывым пасьля забойства двох яго таварышоў, прызнаўся, што быў вызначаны макэдонскім рэвалюцыйным камітэтам для выкананьня замаху на Ковачэвіча, прычым дабавіў, што сам быў-бы асуджаны на сьмерць, калі-б адмовіўся выканаць гэты замах.

У ЧЫРВОНЫМ ПЕКЛЕ.

ВЫКІНУЛІ З КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ.

З Масквы паведамляюць, што ўрад кантрольнай камісіі выключыў з камуністычнай партыі Прэабражэнскага, Сярэбракова і Харова, якія прызналіся, што былі эрганізатарамі нядаўна выкрытай у Маскве тайнай антыпартыйнай друкарні.

ЗАМАРДАВАНЬНЕ ВАЕННАГА КАМІСАРА.

З Петраграда паведамляюць, што невядомымі асобамі замардаваны быўшы камісар Петраградзкага веннага вокруга Сергееў. Замардаваны зьяўляецца адным з актыўных вучасьнікаў стлуменьня Кранштадзкага паўстаньня ў 1921 г. Забойцы схаваліся. Г.П.У. зрабіў масавыя арышты.


Жаба і вол.

(З баек Крылова.)

На пожні жаба, ўбачыўшы вала,
Надумала ўзростам з ім зраўняцца.
(Яна завісьніцай была)!
І вось — давай старацца!
Чапурыцца, пыхціць і дмецца..
— „А што, кума, ўжо здаецца,
Зусім на роўні з ім я стала?“
Пытаецца кумы.
— „Куды там!“ — тая адказала.
— „Ну, а цяпер, пабач вось як надмуся,
Ці-ж не як ён вялікай я кажуся?“
— „Ды не“...
— „А вось цяпер, ці-ж я ня роўня з ім?“
— „Ні крышачкі...
Пыхцела жаба ды пыхцела,
І кончыла свае тым прадпрыемства,
З валом што не здабыўшы падабенства —
З натугі трэснула і акалела!

Пабачце вокал: колькі ёсьць
Паміж людзей вось гэткіх жаб:
Дмецца, пнецца гэткі госьць —
Уверх пралезьці неяк каб. —
І вось ўжо—ўжо здаецца!
Дапяў нарэшце сваю мэту:
Усім даццa ў знакі ён імкнецца...
Аж раптам „знамянітасьць“ гэту
Лёс жабы з байкі спатытае:
Бязслаўна свой жывот канчае...

Б. Друцкі.



ЖАБА і ВОЛ.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Касцы.

(Абразок аднэй з нашых вёсак, дзе пануе камуністычны дух).

Ці былі вы калі небудзь ў вёсцы Сівіцы?!... Не?!.. А ці здаралася мець якую колячы справу з Сівічанамі?! Так сама не?!. Дык дарма-ж вы хваліліся, што ведаеце свой народ і жыцьцё ягонае. Сівіца (Маладэчанскага пав. Бэніцкае гм)—вёска вялікая, ха-

---

„Ў паветровым акіяне
„Без вясла і без вятрыл
„Ціха езьдзяць (?) у тумане
„Хоры стройныя сьвяціл“.

і далей:

„Па палёх неагляданых (?)
„Неба, ходзяць без сьлядоў
„Стады, вокам не злапаных (?)
„Валакністых аблакоў“.

Вось-жа прадусім зварот „*езьдзяць*“ ўжыты у адносінах да зораў, калі ў арыгінале маем „плавают“, бо *езьдзіць можна толькі на чымсь, а плаваць можна і самому*, дзеля-ж таго, што на‘т і поэтыцкая фантазыя бывае звычайна пабудаванай на пэўных рэальных падставах здаровае лёгікі, у даным выпадку ў адносінах да сьвяцілаў нябесных мог быць ўжыты выключна толькі зварот арыгіналу: „плаваюць“, які пры гэтым не выклікае і ніякіх тэхнічных труднасьцяў пры ўжыцьці яго ў перакладзе, дык гэтае дзіваснае „езьдзяць“ можна тлумачыць толькі ізноў-жа, пахвальным у тэорыі, але кепскім у рэалізацыі, імкненьнем да тае-ж „языковае незалежнасьці“ ад арыгіналу аб якой мы ўжо тутака раз ўспаміналі.

Вагульлі трэ‘ адзначыць што гэтыя, „*езьдзючыя*“ (з лёгкай рукі Макара!) „*сьвяцілы*“ з‘яўляюцца найбольш скандальным промахам усяго перакладу!!!

Гэтак жа няўдалы ёсьць зварот:

„Па палёх неагляданых
„Неба... “

маючы адказываць страфе:

„Средь полей необозримых
„В небѣ...“
— арыгінальнага тэксту.

„Неаглядны“ значыць тое-ж што „ня бачаны“, тымчасам чалавек можа бачыць прастор нябёсаў; „необозримый“ — жа азначае „неабгорнуты вокам“ і сапраўды хоць чалавек бачыць прасторы нябёсаў аднак ня можа іх абняць сваем сьмяротным вокам дзякуючы іх вялізарнасьці.

Несуадказным гэтак-жа зьяўляецца і чарговы зварот „вокам не злапаных“ ў адносінаў да воблакаў, калі ў арыгінале: „неўловімых“!

Справа ў тым, што воблакі мы можам бачыць (лавіць вачыма) колькі хоць, але ня можам злавіць іх у даслоўным сэнсе, скажам — рукамі, бо гэта імгла і аб гэта ласьне і йдзе аўтару!

Гэтым канчаем агляд часткі І-шай поэмы.

У частцы ІІ-ой і апошняй вельмі сымпатычнае уражаньне выклікае сваей прастатой і сакавітасьцяй вядомая скарга Тамары, займаючая ўсю главу І-шую часткі ІІ-гой; пераложана яна ўся жывой, вобразнай, беларускай мовай; вось яе пачатак:

„Татулька мой! пакінь пагрозы
„Свае Тамары ты ня лай.
„Я плачу. Бачыш мае сьлёзы?...
„Іх ты, ня першыя, пазнай...
„Дарма зьбіраюцца чаргою
„Сюды малойчыкі здалёк...
„Нямала ў Грузіі дзявок;
„Ня быць мне жонкай нічыёю“... і г.д. і г.д.

Добра пераложана і глава ІІ-гая; за тое ў ІІІ-цяй выклікае пэўныя сумлівы дарэчнасьць віцьеватага звароту: „субзор‘і крыніц“, ужытага заместа скромнага „ключи“ ў арыгінале.

Шмат горш выглядаюць справы у главе IV-ай, дзе спатыкаем гэткі, *відаць дзеля рыфмы* ўжыты, зварот:

„... й на ўсход падаўшы галасок (?)
„Маліцца клічуць муэзіны:“

(Ў арыгінале:
„И, обращаясь на восток,
„Зовут к молитвѣ муэззины;“)

Вось-жа здрабнелае, *дзіцяча-жаночае*, слова „галасок“ ўжытае тутака ў адносінах да *сталых мужчынаў*: сьвятароў — муэзінаў, сьпеўна *выкрыкваючых* вэрсэты з Корану, — з‘яўляецца гэтулькі-ж недарэчным колькі-й сьмяхотным!

Дасканальна пераложаны абшырны дыялёг паміж Дэмонам і Тамарай у главе Х-ай; вось для прыкладу адзін з найбольш популярных яго адрыўкаў:

„Я той, каторага, бывала,
„У начной ты чула цішыне,
„Аб кім душа твая шаптала,
„Чым тугу ты адгадала,
„Абраз чый бачыла у сьне;
„Я той, хто ўсю надзею губіць,
„Як толькі жыць яна пачне,
„Я той, каго ніхто ня любіць
„І век жывое ўсё кляне,
„Нішто прасторы мне і годы;
„Я біч рабоў маіх зямных,
„Нябёс я вораг, зло прыроды,
„І аачыш я ля ног тваіх!“

У адным з адказаў Тамары Дэмону на ст. 31-ай незразумелай ёсьць, крыючая ў сабе супярэчнасьці, фраза:

„*Ды ўсё, што трэба ведаць, маеш*“.

Бо тое што трэба ведаць, можна ведаць або ня ведаць, але не можна мець, дык хіба што гэта абмылка ў друку і мелася быць: „знаеш“ (праўда, гэта быў-бы русыцызм, але яго можна было-б выбачыць з увагі на рыфму).

Ў поэтыцкую характарыстыку крыку Тамары у главе ХІ-ай (ст. 35) даволі-ткі безпадстаўна ўведзяны тэрмін „бяда„ заместа—„страданье“, якое бачым тут ў арыгінале.

Гэтак сама недарэчным ёсьць зварот аб Дэмоне.

„*Бліщчэў, як громава струя*“ (ст. 40),

бо гром гэта гук, а гук ня можа бліщчэць, дык магла тут быць гутарка толькі аб электрычнай струі—маланцы, як гэта і ёсьць ў арыгінале, дзе сказана:

„*Блистал как молніи струя*“.

Гэтым канчаем агляд часткі ІІ-гой поэмы.

Бяручы агулам частка ІІ гая поэмы апрацавана лепш чымся першая.

Да заганаў, ўласьцівых усяму перакладу належыць лішне частае *і матываванае выключнк вымогамі вэрсыфікацыі* (разьмер і ўдарэньне) ужываньне дробных слоўцаў кшталтам: *там, нек ён, ўжо* і г. д., — асабліва-ж — дакучліва: „*вось*“!

Гэтыя лішнія слоўцы і некаторыя надта-ж ужо прымітывныя звароты пазбаўляюць пераклад М. К. належнай лёгкасьці, гладкасьці і гучнасьці, вымаганай ад поэтыцкага твору, складаючых ягоны чар і прывабнасьць.

Агулам, не нэгуючы заслугаў п. Краўцова, які ў гэтым выпадку, калі можна выразіцца, „араў навіну“, тлумачучы першым „Дэмона“, трэ‘ чакаць ў недалёкай будучыні новых перакладаў гэтае ж поэмы больш мілагучных акруглых і стыльных чымся сяньняшні, ў якіх пры гэтым лепш будуць разьвязаны і ўсе тыя літэратурна — мастацкія проблемы ды й вэрсыфікацыонныя труднасьці, якія паўстаюць тут прад перакладчыкам.

ЯЗЭП СЬВЕТАЗАР.

Новыя беларускія школы у Палескім вокрузе.

Т-ва Бел. Школы атрымала афіцыяльнае паведамленьне ад п. Куратара Палескага Школьнага Вокругу, што ў гэтым годзе ў межах Палескага Вокругу адчыняюцца новыя беларускія і польска-беларускія (утраквістычныя) урадавыя пачатковыя школы у наступных мясцовасьцях:

БАРАНАВІЦКІ ПАВЕТ.

1) У Хлюпнічах — — — 1 кл. белар. шк.
2) Вялікай Мядзьведцы — 2 кл. белар. шк.
3) Гарадышчы — — — 5 кл. польска-бел.
4) Жалезьніцы — — — 2 кл. польска-бел.
5) Канюхох — — — — 1 кл. польска-бел.
6) Галынцы — — — — 3 кл. польска-бел.

НЯСЬВІСКІ ПАВЕТ.

7) Ябланоўшчыне — — — 2 кл. белар. шк.

ПРУЖАНСКІ ПАВЕТ.

8) Бартнавічах — — — — 1 кл. бел. шк.
9) Яловай — — — — — — — 1 кл. бел. шк.
10) Блудні — — — — — — — 4 кл. пол.-бел.
11) Хвалаве — — — — — 2 кл. пол.-бел.
12) Раўбецку — — — — — 2 кл. пол.-бел.

СТАУПЕЦКІ ПАВЕТ.

13) Пагарэльцах — — — — 4 кл. пол.-бел.
14) Загор'і — — — — — — 2 кл. пол.-бел.
15) Вялікіх-Журавічах — — 6 кл. пол.-бел.

Гэткім чынам маюць быць адчынены ў Палескім Шк. Вокр. 5 школ беларускіх і 10 польска-беларускіх.

таў больш за сотню. Праўда, бедна жывуць Сівічане, але скуль тое багацьце будзе — ні гародаў, ні садоў няма. Калі-бы хто і адважыўся штө засадзіць, дык усё роўна суседзі выдзяруць, абломяць. І гола, пуста навакола, як у якіх цыганаў...

Здарылася ў нядзелю 25.IX у засьценку Каралевічы вясельле. Зьехаліся госьці, панаходзіла суседзяў... Падайшлі ў вечары і сівіцкія дзяцюкі, чалавек гэтак з дваццаць.. Але, як яны толькі паказаліся, дык усё так і прыціхлі: вясельле не вясельле, а быццам хаўтуры зрабіліся.. Нашыя хлопцы забіліся ў куток, дый сядзяць, баяцца іх...

Ого! Калі Сівіца гуляе, аж трэскі ляцяць!...

У Каралевічах ёсьць два вяліх сады. Вось Сівічане і пайшлі шукаць спажывы... Асьвятліўшы электрычнымі ліхтаркамі яблані, яны ламалі сукі, лазілі на дрэвы ў ботах (што вельмі шкодзіць дрэву).. Вы спытайцеся, дзе-ж былі ў гэты час гаспадары? Гаспадары знаёмыя з Сівічанамі сядзелі ў хатах і баяліся на'т выйсьці...

На заўтра раніцой гаспадар, у якога было вясельле, агледзеўся, што ў яго згінула 5 кос, якія ён гэтак пільна, здаецца, прыхаваў за хатай... Але, дзе там! Аглядзелі Сівічане! Шкада, праўда, 5-ці кос, бо грошы каштуюць! А пяць сівіцкіх касцоў на лета будуць касіць, дый пасьвістываць...

Ляксей Дзюба.

Спэктакль у Палачанах.

Гуртком „Прасьветы“ 2 верасьня быў наладжаны спэктакль, пасьля якога адбыліся і скокі. Гралі п'есу „Чорт і баба“. Усе вучасьнікі гралі надта добра і віталіся прысутнымі галоснымі воплясками. Чарта граў — М. Белан, бабу—Веліна Тытуш, Мікіту — А. Бурачонак і Марыську — Паўліна Белан. Гэты спэктакль разахвоціў вучасьнікоў да далейшага, і яны пачалі рыхтавацца да новага спэктаклю.

А. Б.

М. Гарадок

(*Маладэчанскага павету*).

5 — IX г. г. на рынках, дзе прадаюць скаціну, селянін Казімір Залуцкі з Красасельскай гміны вёз прадаваць сьвіньню і авечку. Авечка на возе пачала нешта кідацца і перакінулася ўверх нагамі. Паліцыянт, які быў у браме, зараз-жа і прычапіўся — то дакумэнты яму свае пакажы, то пасьведчаньне на сьвіньню і авечку пакажы — і разглядзеўшы ўсё гэта, пачаў запісваць у сваю кніжачку і на запытаньне паліцыянта якой Залуцкі веры, той адказаў яму па беларуску, што каталік.

— Калі каталік, дык і адпавядаць мусіш па польску!...

Залуцкі яму кажа, што нас па польску ня ўчылі, што мы маем сваю родную мову...

Але паліцыянт ані слухаў і сказаў на астатку, што Заруцкі будзе укараны за тое, што авечка ляжала „nie w porządku“!..

Людзі, якія былі пры гэтым, кажуць паліцыянту: чаму-ж гэта, калі жыды цялят і авечак на ўсялякі спосаб носяць, дый яшчэ як палкамі лупяць па конях... але паліцыянт і ня слухаў, быццам ня чуў...

А сяляне кажуць: за сьвядэцта заплаці, за рынак, што ўвёз, заплаці, а нарэшце яшчэ чакай кары... Ну і жыцьцё?!...

Наглядчык.

Тутэйшая хроніка.

— ВЫЕЗД ВАЯВОДЫ п. РАЧКЕВІЧА ДА ВАРШАВЫ. Віленскі ваявода п. Рачкевіч выехаў 11 кастрычніка да Варшавы па службовым справам.

— З ЖЫЦЬЦЯ „БЕЛ. ХАТКІ“ Ацчыт ў „Беларускай Хатцы“ п. Канапацкага на тэму „Беларуская вайсковая справа ў 1919 і 1920 г. у Польшчы“, які быў вызначаны на 11 гэтага месяца не адбыўся, а пераносіцца на чацьвер 20 гэт. м-ца на 5 гадз. па папалудні.

— АХВЯРА ДЛЯ ПАЦЯРПЕУШЫХ АД ПАВОДКІ. „Беларуская Хатка“ ахвяравала 150 злотых для пацярпеўшых ад паводкі ў Усх. Галіцыі. Грошы пярэданы ў віленскі ваяводзкі камітэт па збору ахвяраў для пацярпеўшых ад паводкі ў Усх. Галіцыі.

— АРЫШТ АНТОНА ЛУЦКЕВІЧА 12 кастрычніка, а 7 г. раніцы па загаду пракурора палітычная паліцыя зрабіла вобыск у памешканьні Антона Луцкевіча (Віленская вул. № 8), аднаго з галоўных кіраўнікоў „грамады“ і фактычнага рэдактара грамадаўскіх друкаваных органаў „Нашых Праўдаў“, „Нашых Працаў“, — арыштавала і пасадзіла ў турму на Лукішках. Арышт яго знаходзіцца быццам у зьвязку з судзебным сьледзтвам у справе „Грамады“.

— РУССКОЕ НАРОДНОЕ ОБ'ЕДІНЕНІЕ і УКРАІНЦЫ. Орган „Расійскаго Народнаго Об'единенія в Польше“ віленское „Утро“ (№ 115) зьмяшчае з няскрываемым самазадаваленьнем і бяз усякіх камэнтарыяў наступную карэспандэнцыю з Луцку: „Нам пішуць з Луцку, што агульны сход саюзу валынскіх абшарнікаў загадаў свайму ўраду патрэбаваць ад школьных уладаў адмены загаду аб абавязковым выкладзе „ўкраінскай“ мовы ў ваўсіх мейсцовых школах.

Апрача гэтага ў мінуўшую нядзелю ў Луцку адбыўся сход дэлегатаў ад розных польскіх арганізацыяў з удзелам бацькаўскіх камітэтаў усіх луцкіх гімназіяў (гэта значыць і расейскай, бо ў папярэднім нумары „Утра“ пісалася, што і расейцы галасавалі за гэтую рэзалюцыю Рэд.)

Дакладчыкам па пытаньню аб забавязаньні „украінскай“ мовы быў п. Перацятковіч.

Пасьля ажыўленых гутарак было пастаноўлена прад'явіць куратару вучэбнага вокруга ультыматыўнае жаданьне аб адхіленьні з гімназыяльных праграмаў украінскай мовы, як абавязковага прадмета. У выпадку невыкананьня гэтага ультыматуму ў 10-ці дзённы тэрмін — сход пастанавіў прыступіць да энэргічных чынаў па прыкладу львоўскіх.

За ўказаную рэзалюцыю аднагалосна галасавалі ўсе прысутныя, ў тым ліку і жыды (і расейцы *Рэд*)“..

Што-ж на гэта адкажуць паны сэн. Багдановіч, Назарэўскі і паслы Ярэміч з Рагуляй, „блёкуючыяся“ з расейскім нацыянальным аб'яднаньнем, якое ў сваім органе друкуе гэткія карэспандэнцыі, называючы ўкраінскую мову ня інакш, як у чужаслове.

Калі Расейскае Нац. Аб'ядн. ваража выступае проці ўкраінскай мовы на Волыні, дык што-ж гаварыць пра беларускую мову!? Ці-ж расейскі абшарнік з Наваградчыны Молер і расейскі пасол Серэбранікоў не выступалі на львоўскім расейскім зьезьдзе з заявою, што ў Наваградчыне няма ані воднага беларуса? Ласьне на гэтых днях у Луцку адбыліся выбары да местовай рады, ў якую былі выбраны толькі адзін расеец і тры ўкраінцы, хаця першыя ня хочуць прызнаваць за імі права на сваю родную мову ў школах, дапушчаную ўрадам...

Дык няхай спытаюць беларусы сваіх паноў сэнатараў Багдановіча і Назарэўскага і паслоў Ярэміча і Рагулю; „куды яны вядуць яго з гэткімі хаўрусьнікамі тыпу Серэбранікава, Молера і Перацятковіча, з якімі ўсюды выступаюць супольна, рэклямуюць у сваіх друкаваных органах і выцягваюць на паверхню палітычнага жыцьця на беларускім карку?!..

Няшкодзіла-бы нашым паслам хоць крыху мець пашаны да сваіх пасольскіх манцатаў, адтрыманых, дзякуючы беларускім галасам...

— КАНФІСКАЦЫЯ „НАШАЙ ПРАЦЫ“. Па загаду Камісара Ураду на м. Вільню сканфіскаваны № 3 грамадаўскае „Нашае Працы“ ад 8 кастрычніка.

— САМІ СЯБЕ ВЫБІРАЛІ... У сераду 12 г. м. адбылося паседжаньне Бел. Нац. Камітэту № 1, у склад якога, пасьля стварэньня насл. Ярэмічам гэткага самага Камітэту пад N 2, уваходзяць толькі сябры Т-ва Школы і Каапэр. Банку.

На парадку дзенным былі: справаздача ўраду, выбары і бягучыя справы. Камітэт вынес пратэст проці арышту п. Луцкевіча. Новым старшынёй Камітэту выбраны сэнатар Уласаў.

Цікава адзначыць, што як Кам. N 1, так і Кам. № 2 закансьпіраваны ў сваім складзе і новых сяброў не дапушчаюць. Гэтак ня быў дапушчаны прадстаўнік эсэраў п. Мамонька.

Пісьмо у рэдакцыю.

Паважаны пане Рэдактар!

Зразумеўшы, што Ваша газэта больш бароніць нашыя інтарэсы, як „Сялянская Ніва“ ці „Наша Праўда“, хачу мець сваю родную газэту „Беларускае Слова“, і шчыра прашу пана Рэдактара выслаць мне пробны нумар на мой адрэс.

Дэкляарацыя

Жыхара в. Літвы, Палачанскай гміны, цяпер пражываючага ў вёсцы Вэнцловінэнты, Смаргонскай гм. Ашмянскага пав.

БРАТЫ БЕЛАРУСЫ!

Вітаю Вас—я шчыры беларус—і заяўляю, што не належыў да ніякіх партыяў, хаця ў нас у Заходняй Беларусі палітычны рух, пачынаючы з 1906 г., разьвіваўся паводле двох прынцыпаў—сацыяльнага і нацыянальнага. Тут былі і беларускія эсэры, і эндэкі і г. д.

Але цяпер, пасьля 1920 г. найбольш выявіліся ў нас на Беларусі новыя групы новага напрамку — „Грамада“ і „Сель.-Саюз“, якія зганьбілі імя Беларускага Народу ў нашай сталіцы Вільні, ідучы на запятках расейцаў „чарнасоценцаў“, альбо ў хвасьце камуністычных міжнарадовых падонкаў. А ў той час Беларуская Нацыянальная Рада і Партыя і Беларускі Нац. Выб. Камітэт палажылі шмат высілкаў, праводзячы ў самаўрады ўсіх беларусаў. Дзе толькі працаваў Бел. Нац. Выб. Камітэт, там прайшло да 80 проц. шчырых беларусоў пад сьцягам нацыянальнай згоды і адзінства. І я пэўны, што ўсе новавыбраныя радныя будуць суменна працаваць на карысьць нашага сялянства на самаўрадавым полі.

Бачучы тое, што Бел. Нац. Рада і Партыя карыстаецца найбольшым уплывам сярод Беларускага Народа, прашу п. Старшыню Бел. Нац. Рады і Партыі выслаць мне камплект літэратуры на арганізацыю Гуртка Т-ва „Прасьветы“ і залічыць мяне ў сябры Беларускай Нац. Партыі.

Дык няхай жыве Бел. Нац. Рада!
Няхай жыве Бел. Народ!

Міхал Бэкіш.

5/X.-27 г.

Ад Рэдакцыі: Прасімую партыйную літэратуру і газэты высылаем.

Пошта Турэц, в. Лыковічы, гміна Ярэмічы, Стаўпецкага павету.

Аляксандэр Драб.

10-X.-27 г.

Ад Рэдакцыі: Газэта будзе выслана.

Паштовая скрынка.

В. Гарылко, П. Януковіч, С. Путырскі, В. Путырскі, П. Усьціновіч, М. Швэдо, В. Глускі, Л. Савіцкі—пробныя нумары высылае. Прысылайце грошы за падпіску.

Саўчук — „Маланка“ ўжо ня выходзе.

Ці здольна да вайны Чырвоная армія?

Вядомы расейскі ваенны пісьменнік палкоўнік гэнэральнага штабу К. Шумскі адказывае на гэтае пытаньне цікавым артыкулам у парыскім „Журнал“.

„Вайна — гэта працяг палітыкі з аружжам у руках“ сказаў Фон-Дэр-Тольц, аўтар вядомага твору: „Вааружоны Народ“. Гэтымі славамі ён хацеў падкрэсьліць з пункту гледжаньня стратэгіі важнасьць палітычнай падгатоўкі вайны. Гэта аксіёма ня зусім вядома „таварышу“ Варашылаву, ваеннаму камісару, які некалькі разоў паўтараў у сваіх прамовах, што чырвоная армія гатова. У сутнасьці-ж палітычная падрыхтоўка вайны значна менш карыстна для рад. Расеі, чым сытуація, створаная Вільгельмам II перад вялікай спатычкаю эўрапейскіх народаў.

Вільгельм быў пераканаты ў падтрыманьні трох дзяржаваў: Аўстрыі, Турцыі і Баўгарыі, тады як рад. Расея знаходзіцца ў поўным адзіноцтве. Апрача таго чырвоная стратэгія павінна яшчэ чырвонай дыплёмацыі нявыгаднай граніцаю між Расеяй і Польшчай, граніцаю — якую радавым палітыкам прымусіла рыжская ўмова.

Гэта граніца, цягнучаяся больш як на 1,400 кілямэтраў, зусім пазбаўлена натуральнай перагародкі, калі ня лічыць вучастка пінскіх дрыгваў. Вартасьць гэтага факту будзе яшчэ больш відочнай, калі прыняць пад увагу, што мабілізацыя чырвонай арміі патрабуе на адзін месяц больш часу, чым мабілізацыя польскай арміі.

Дык ясна, што ў выпадку аружнай спатычкі між Польшчаю і Радамі, польская армія будзе гатова першаю і перанясе вайну на радавую тэрыторыю, ніпчачы яе. Чырвоная армія, ня маючая магчымасьці сканцэнтравацца і манэўраваць інакш, як па старым нялічным і благім жалезным дарогам, прымушана будзе прадставіць ініцыятыву ваенных дзействаў польскай стратэгіі і адцягнуць далёка назад лінію свайй концэнтрацыі, каб не апынуцца растроеннай ў гэты небясьпечны момэнт.

Пагранічная лінія праходзіць стасункова недалёка ад трох паважных цэнтраў: Петраграда, Масквы (каля 600 кілям.) і Кіева (каля 250 кіл.). Больш паловы і ў той-жа час самыя большыя ваенныя майстроўні распаложаны каля гэтых сталіцаў.

Гэткім чынам тры лёгічных напрамкі наступленьня польскай арміі пагражаюць тром сталіцам, самым найвялікшым раёнам ваеннай прамысловасьці, жыцьцёвым цэнтрам, як напр., Украіна, Балтыцкі флёт, які прымушаны будзе пакінуць сваю адзіную базу Кранштадт і аддаць у варожыя рукі ўсе арсэналы, дэкі, магазыны, свае партовыя базы. Да гэтага належыць далучыць яшчэ сэпаратыўныя імкненьні пагранічных раёнаў (Украіна, Беларусь), напружанае палітычнае палажэньне ўнутры самой радавай Расеі і неабходнасьць захаваць заслоны на другіх расьцягнутых граніцах Расеі дзеля недахватнай палітычнай падрыхтоўкі вайны.

Мы разглядзелі палітычную і стратэгічную сытуацыю, падрыхтаваную несьвядомымі людзьмі, а цяпер пазнаёмімся з ваеннай вартасьцю чырвонай арміі, з яе баявою здольнасьцю справіцца з сур'ёзнымі праблемамі, якія ставіць сучасная вайна. У першую чаргу—пытаньне аб ваенным узбраеньні.

Радавая Расея пасядае 82 фабрыкі амуніцыі: 9 выраблюяць ружжа, 4 — гарматы, 17—аэраплянавыя маторы, 9 —порах, 7 — патроны, 6—знарады, 6—ракэты, 10— аптычныя і мэханічныя прылады, 12—хімічныя прадукты, 1—працівагазовыя маскі, 1 —хірургічныя інструмэнты. Апрача гэтага ў рад. Расеі ёсьць 6 конскіх заводаў. На ваенных фабрыках працуе каля 60,000 работнікаў.

Каб ацаніць гэтыя лічбы як належыць, адзначым, што ў часе вялікай вайны на 15,000 францускіх фабрыках і майстроўнях працавала 1,440,000 работнікаў. У прыватных майстроўнях—265,000. Чаго варты 1,200—1,500 аэрапланаў, якія складаюць чырвоны паветраны флёт, калі адна Нямеччына пасьля замірэньня выдала пераможцам больш 14,000 аэрапланаў і 27,000 аэраплянавых матораў, і калі кожная з хаўрусных дзяржаваў мае ў два разы больш аэрапланаў, чым адтрымала ад Нямеччыны?

Чаго варты 60—150 снарадаў на гармату, якія возяцца разам з батарэяй і па 1,000 запасных снарадаў, калі францускія майстроўні дастаўлялі арміі ў 1917 г. 7 мільёнаў 75 мілімэтравых снарадаў кожны месяц? Якую вартасьць можа мець адна майстроўня процігазавых масак, калі ў часе вайны ў Францыі іх выраблялася дзесяткі мільёнаў?

Да гэтага трэба дабавіць, што цяперашнія радавыя майстроўні працуюць незадавальняюча. Доказам гэтага можа служыць факт, што ў Расеі ёсьць 7 рожных мадэляў пяхотнай вінтоўкі, 6 мадэляў 150 мілімэтравай гарматы, маючай 6 абразцоў знарадаў г. д. У чырвонай арміі маюцца ружжа сыстэмаў: расейскай, нямецкай, англійскай, японскай. Гэтая рожнаякасьць разладжае забясьпечаньне амуніцыяй, якую можна наглядаць апрача чырвонай арміі толькі ў кітайскай

Калі мы зьвернемся цяпер да афіцэрскага корпусу чырвонай арміі, дык трэба падкрэсьліць, што маладыя афіцэры, нармальна выпушчаныя ваеннымі школамі, яшчэ больш-менш задавальняючыя. Але вышэйшае камандаваньне значна слабейшае і самыя вышэйшыя пасады заняты людзьмі, якія удзячны сваею кар'ераю больш палітычным пасьпехам, чым ваенным талянтам. Зьверхнікам гэнэральнага штабу зьяўляецца Тухачэўскі, бышы падпаручнык, запасны афіцэр, стары камуніста. Ен зьяўляецца галоўным віноўнікам паражэньня чырвонай арміі ў часе польскай вайны. Праўда, ёсьць некалькі старых гэнэралаў гэнэральнага штабу. Аднак з іх парадамі ніхто ня лічыўся ў часе абсурднага наступленьня на Варшаву. Яны цяпер ня гуляюць ніякай ролі і нават палкоўнік Каменеў, якому цяперашнія кіраўнікі удзячны перамогаю ў хатняй вайне, займае цяпер толькі поўпаважную пасаду інспэктара арміі замест папярэдняй—глаўнакамандуючага ўсімі аружнымі сіламі рэспублікі. Усе гэтыя варункі палітычныя, стратэгічныя, арганізацыйныя, вааружэньня, вышэйшага камандаваньня могуць мець толькі вельмі небясьпечныя, калі не катастрафічныя, вынікі для чырвонай арміі. Далучым, што яна ня можа знайсьці маральнага падтрыманьня ў уціснутага народу.

„Гісторыя ваеннай перамогі—гэта гісторыя перамогі ў культуры, ў прагрэсе“ — кажа вучоны сацыёлаг. Вось дзеля чаго ў цяперашні пэрыяд расейскага жыцьця, калі ўсе творчыя яе сілы прыціснуты, ня можна нічога подобнага чакаць ад расейскай арміі, якая здоляла завяваць для свайго народу вялізарную тэрыторыю ад Балтыцкага мора да Ціхага акіяну і ад Белага мора да Чорнага, Каспійскага і цэнтральнай Азіі.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мостовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.